# СУЧАСНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ Ў СФЕРЫ НАВУКОВАЙ ЖУРНАЛІСТЫКІ

***Ю. М. Лук'янюк***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*lukianqk@mail.ru*

Разглядаюцца сучасныя тэндэнцыі развіцця навуковых беларускіх медыя. Адзначаны асноўныя задачы навуковых медыя. Прааналізавана навуковая журналістыка як форма пазнавальнай дзейнасці.

***Ключавыя словы:*** сістэмаўтваральны фактар; навуковыя медыя; навуковая журналістыка; навуковец.

# MODERN TENDENCIES IN SCIENTIFIC JOURNALISM

***Yu. M. Lukyanuk***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: Yu. M. Lukyanuk (lukianqk@mail.ru)*

The main tasks of scientific media are defined. Scientific journalism as a form of cognitive activity is considered. Examples of scientific digital media and platforms for informing readers about new scientific events are given.

***Key words:*** backbone factor; scientific media; scientific journalism; scientist.

Навуковыя СМІ з'яўляюцца крыніцай інфармацыі аб выніках навукова-даследчай дзейнасці вучоных, спецыялістаў. Нягледзячы на тое, што навуковыя часопісы, на першы погляд, арыентаваны на абмежаваную мэтавую аўдыторыю ў рамках навуковай супольнасці (студэнты, саіскальнікі, эксперты), вынікі даследаванняў становяцца даступнымі ўсім зацікаўленым асобам, якія хацелі б працягнуць сваё навучанне, удасканаліць наяўныя веды, данесці да аўдыторыі новыя навуковыя ідэі і распрацоўкі. Сярод чытацкай аўдыторыі могуць быць як практыкуючыя, а так і маладыя спецыялісты. Адпаведна, асноўнымі задачамі навуковых медыя выступаюць:

– інфармаванне чытачоў аб навуковых распрацоўках, інавацыях, выніках навуковай дзейнасці;

– павышэнне ўзроўню навуковых ведаў спецыялістаў у розных галінах;

– забеспячэнне доступу да інфармацыі для кожнага чытача;

– сумесная работа з навуковымі і адукацыйнымі ўстановамі;

– задавальненне актуальных запатрабаванняў аўдыторыі ў папаўненні навуковай інфармацыі;

– інтэграцыя навуковых ведаў у лічбавую прастору [1].

Аж да цяперашняга часу да навуковай журналістыкі традыцыйна адносілі толькі такія публікацыі, як, напрыклад, інфармацыйнае асвятленне навуковага адкрыцця, інтэрв'ю з даследчыкамі вострых навуковых пытанняў, дыскусіі навукоўцаў, аналітычныя працы, рэпартажы з канферэнцый і г. д. Іншымі словамі, навуковая журналістыка, метадам спрашчэння складанага для разумення шырокім чытацкім масам «сухога», ускладненага тэрміналогіяй, навуковага тэксту, г. зн. яго перакладам, даносіла навіны і падзеі сферы навукі да грамадскасці. Журналісты, якія спецыялізуюцца ў рамках навуковай журналістыкі, практычна заўсёды характарызаваліся не як аўтары, а як рэдактары ці «перакладчыкі». Сучаснай навуковай журналістыцы, як і любой іншай тэматычнай скіраванасці СМІ, уласцівы свае індывідуальныя крытэрыі. Фарміраваліся яны і ўдасканальваліся на працягу доўгага часу, у выніку чаго, на думку шэрагу экспертаў (напрыклад, В. Гедэ, рэдактара нямецкай версіі «Папулярнай механікі»), выглядаюць так: сваю дзейнасць навуковы журналіст абавязаны ажыццяўляць па строгіх правілах, адступленне ад якіх недапушчальне; тэкст і змест матэрыялаў навуковай журналістыкі выключаюць наяўнасць літаратурнага складніка, алегорый, метафар і інш.; асвятляючы тэмы, складаныя для ўспрымання звычайнага чытача, навуковая журналістыка павінна ўлічваць асаблівасці чытацкай аўдыторыі, умець дакладна і цікава данесці навуковую навіну для разумення, асветы і прыцягнення грамадскасці, якая не мае спецыялізаванага адукацыйнага ўзроўню ў той ці іншай навуковай сферы.

Шматгадовы вопыт навуковай журналістыкі паказвае, што аб'ектам адлюстравання тэарэтычных праблем навукі і тэхнікі ў часопісах выступаюць факты, здагадкі, ідэі, арыгінальнасць і дакладнасць вынікаў. Пры гэтым крытэрыямі чытальнасці навуковых артыкулаў з боку аўдыторыі становяцца ступень навізны, метадалогія збору, вывучэння, аналізу і сістэматызацыі рэальнага матэрыялу, а таксама візуальнае афармленне атрыманых вынікаў даследавання. У дадзеным выпадку аўтар выступае ў дзвюх пазіцыях:

– вучонага, даследчыка, навуковага спецыяліста, распрацоўшчыка, які прадстаўляе аўдыторыі навуковыя пошукі, выяўляе тэарэтычную праблему і робіць навукова абгрунтаваныя канкрэтныя высновы;

– журналіста, які абгрунтоўвае актуальнасць і праблематыку свайго даследавання, звязвае з практычным бокам дзейнасці і вызначае перспектывы вывучэння пытання [2].

Такім чынам, навуковая журналістыка працягвае заставацца формай пазнавальнай дзейнасці, паколькі працэсамі пазнання з'яўляюцца ўспрыманне, асэнсаванне, аналіз, абагульненне, сінтэз, інтэрпрэтацыя інфармацыі па вызначанай праблеме даследавання. Пры гэтым дадзеныя працэсы ажыццяўляюцца ў двухбаковым парадку: ад аўтара да навуковай супольнасці ў цэлым і ад аўтара да канкрэтнага чытача.

Станаўленне і развіццё навуковай журналістыкі як сферы прафесійнай дзейнасці журналіста даследуецца многімі навукоўцамі ў галіне філалагічных навук. Так, праблемам прафесіяналізацыі прысвечаны працы Р. Абрамава, С. Альтшулера, І. Артабалеўскага, В. Балхавінава, В. Іўчанкава, Н. Фральцовай, Л. Шасцёркінай і інш. Практычныя даследаванні праводзяцца навукоўцамі МДУ імя М. В. Ламаносава, БДУ і іншых ВНУ.

Аднак сёння патрабуецца ўдакладненне паняцця «навуковы журналіст», а сучасныя асаблівасці навуковай журналістыкі на прыкладах канкрэтных СМІ мала вывучаны, што абгрунтоўвае неабходнасць і актуальнасць дадзенага даследавання. Адмысловай увагі патрабуе даследаванне залежнасцяў фарміравання прафесійнай спецыфікі асобы навуковага журналіста, змены патрабаванняў да яе пад уплывам вонкавых фактараў, што паказвае неабходнасць падобнай працы.

Значную ролю адыгрывае існаванне навукі ў якасці асаблівага сацыяльнага інстытута, які дазваляе рэканструяваць не толькі яе кагнітыўную, але і сацыяльную прыроду, сацыякультурную абумоўленасць працэсу навуковага пазнання, сацыяльны характар суб'екта навуковага пазнання, а таксама істотную ўзаемасувязь навукі з іншымі сацыяльнымі сістэмамі і інстытутамі грамадства (дзяржавай, правам, эканомікай, ідэалогіяй, сродкамі масавай інфармацыі).

Беларускія навуковыя медыя на сёння выбіраюць некалькі стратэгій прысутнасці ў інфармацыйнай прасторы. Першая стратэгія заключаецца ў тым, што навуковы часопіс развівае свой кантэнт выключна ў электронным выглядзе з дапамогай публікацыі навуковых артыкулаў на сайце, рассылак электроннай версіі, інтэграцыі на сайты вядучых ВНУ краіны. Другая стратэгія прадугледжвае захаванне друкаванай версіі часопіса ў абмежаваным тыражы і па запыце чытача і публікацыі online-версіі на сайце часопіса.

Трэба адзначыць, што цэнтрам кансалідацыі навуковых СМІ з'яўляецца Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, якая рэгулярна праводзіць роз-

ныя навукова-практычныя і даследчыя канферэнцыі, нарады, навуковыя сесіі па пытаннях каардынацыі дзейнасці вучоных, спецыялістаў і саіскальнікаў, вынікі работы якіх публікуюцца ў навуковых часопісах. Цяпер НАН Беларусі выдае больш за 50 навуковых часопісаў, бюлетэняў і зборнікаў. Галоўнымі з іх з'яўляюцца афіцыйныя часопісы акадэміі «Даклады Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» і «Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі». У задачы НАН Беларусі таксама ўваходзіць выданне навукова-папулярнай літаратуры, у тым ліку і за яе межамі.

Такім чынам, на аснове праведзенага аналізу мэтазгодна вылучыць наступныя сістэмаўтваральныя фактары, якія ўплываюць на развіццё навуковых медыя Беларусі:

1. Змяненне крытэрыяў «чытальнасці» навуковых артыкулаў з боку аўдыторыі. Важнымі для чытача становяцца ступень навізны, метадалогія збору, вывучэння, аналізу і сістэматызацыі рэальнага матэрыялу, а таксама візуальнае афармленне атрыманых вынікаў даследавання, што абумоўлівае запатрабаванасць таго ці іншага навуковага медыя, яго рэпутацыю ў навуковай супольнасці.

2. Змяненне пазіцыі аўтара навуковага артыкула (навуковец, даследчык і журналіст) накіроўвае мэты развіцця навуковых медыя на адлюстраванне актуальных тэарэтычных праблем, цікавых шырокай масе чытачоў, узаемасувязяў з практычным бокам дзейнасці перспектыў далейшага вывучэння пытання.

3. Глабалізацыя рынку медыя ў цэлым і кансалідацыя навуковых медыя ў рамках навуковай супольнасці, у якую ўваходзіць розная чытацкая аўдыторыя: а) не толькі навукоўцы, даследчыкі, але і спецыялісты-практыкі, студэнты, эксперты, якія імкнуцца папоўніць, удасканаліць свае тэарэтычныя веды, перавесці іх на ўзровень практыкі, прадставіць новыя навуковыя ідэі вырашэння актуальных пытанняў; б) чытачы з розных краін / рэгіёнаў, зацікаўленыя у навуковых даследаваннях практычнага характару.

4. Узрастанне запатрабавання аўдыторыі ў даступнасці і пастаяннай актуалізацыі навуковых ведаў, што забяспечваецца за кошт інтэграцыі навуковых медыя ў лічбавую прастору (падпіскі, інфармаванне аб канферэнцыях, прысвечаных навуковым даследаванням і інш.).

### Бібліяграфічныя спасылкі

1. Наука в Беларуси – состояние и перспективы развития / под ред. С. В. Шлычкова. Минск: ГУ «БелИСА», 2022. 44 с.
2. *Парафонова В. А.* Некоторые тенденции в развитии современных научно-популярных журналов: уточнение типологической картины // Вестник Москов. ун-та. Сер. 10, Журналистика. 2009. № 3. С. 156–167.